3. *Памяць:* Карэліцкі раён. – Мн., 2000.
4. *Ткачёв М.А.* Замки Белоруссии. – Мн., 1987.

*Ю.Г. Ксеневіч*

## МУЗЕЙ РЭВАЛЮЦЫІ БССР у 1926–1941 гг.

Поспех любога дзяржаўнага музея залежыць ад эфектыўнасці падтрымкі яго з боку дзяржавы. Менавіта дзяржава стварае ўмовы, неабходныя для развіцця музеяў. У першыя гады савецкай улады адметнай з’явай у развіцці музейнай справы было стварэнне музеяў новага тыпу – музеяў рэвалюцыі. У канцы 1920-х гг. колькасць гісторыка-рэвалюцыйных музеяў СССР, паводле архіўных даных і перыёдыкі тых гадоў, перавышала 100 [1]. Знаходзячыся ў сістэме Гістпарта, гэтыя музеі разглядаліся як важныя сродкі прапаганды камуністычнай ідэалогіі.

Дом-музей I з‘езда РСДРП, які адкрыўся 14 сакавіка 1923 г. [2] у Мінску, стаў першым музеем, прысвечаным палітычнай гісторыі БССР. Праз тры гады, менавіта 2 мая 1926 г. [3], на асігнаванні СНК быў адкрыты Музей рэвалюцыі БССР (вул. Урыцкага, 4а) у двухпавярховым будынку плошчай 720 кв. м. [4] (цяпер вул. Гарадскі вал, на перакрыжаванні з вуліцамі Інтэрнацыянальнай і Валадарскага), а Дом-музей I з‘езда РСДРП стаў яго філіялам.

Паводле распараджэння Бюро ЦК КП(б)Б ад 7 мая 1926 г. [6], на ЦВК БССР ускладаўся абавязак фінансавання Музея рэвалюцыі, а кіраўніцтва ім – на Гістпарт ЦК КП(б)Б. Арганізоўваліся камандзіроўкі ў абласныя цэнтры, а таксама ў Маскву і Ленінград з мэтай пошуку і збору матэрыялаў. Экспазіцыя музея будавалася па ўзоры Дзяржаўнага музея Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Петраградзе і Музея рэвалюцыі СССР у Маскве і ў асноўным уключала копіі матэрыялаў па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Расіі. Так, з 1300 экспанатаў у 1925 г. толькі каля 400 адносіліся да Беларусі [6]. Быў і беларускі аддзел, які меў арыгінальныя дакументы: фотаздымкі, партрэты, архіўныя матэрыялы, пракламацыі БСГ, Бунда, народнікаў. Час

станаўлення музея прыпадаў на перыяд беларусізацыі, калі нацыянальная палітыка бальшавікоў садзейнічала росквіту асветы і культуры. Сярод кіраўніцтва БССР яшчэ было разуменне, што без вывучэння матэрыялаў розных партый, якія дзейнічалі ў Беларусі, немагчыма дэтальна вывучыць гісторыю партыі бальшавікоў. Другая палова 1920-х гг. была перыядам росту музея: актыўнага назапашвання фондавых матэрыялаў, пашырэння прапагандысцкай работы. З 1926 г. па 1928 г. колькасць музейных прадметаў павялічылася з 4333 да 5742 адзінак. Аднак спецыфіка складу фондаў вызначалася тым, што з 5742 адзінак толькі 156 адносіліся да рэчавых і мастацкіх матэрыялаў, астатнія – фотаздымкі, дакументы і друкаваныя матэрыялы [7]. Відавочным быў і рост наведвальнікаў. Калі ў 1926 г. музей наведалі 6970 чалавек, то ў 1928 г. – 9609 [8].

30-я гг. у Беларусі адзначаны згортваннем беларусізацыі і масавымі рэпрэсіямі. Такое палітычнае становішча ў краіне не магло не адбіцца на дзейнасці Музея рэвалюцыі. Яго праца, нягледзячы на дасягненні, прызнавалася не адпавядаючай тым задачам, якія ставіліся перад музеем як “органам масавай прапаганды гісторыі партыі на Беларусі”. Недахопам лічылася недастатковасць экспанатаў па гісторыі рэвалюцыйнага руху і КП(б)Б у параўнанні з колькасцю матэрыялаў пра нацыянальныя партыі. ЦК КП(б)Б настойваў на рэарганізацыі музея. Паступова ўсё, што тычылася беларускага, нацыянальнага, знікла са стэндаў музея. Перавага аддавалася адлюстраванню гісторыі РКП(б) і дзейнасці У. Леніна і І.Сталіна. Але рэарганізацыя не задавальняла ЦК КП(б)Б. Нават ставілася пытанне аб закрыцці музея ў 1933 г. [9] і 1936 г. У 1936 г. Музей рэвалюцыі наведала камісія з Інстытута гісторыі партыі, якая выявіла шэраг “буйных палітычных памылак нацыянал-дэмакратычнага і трацкісцкага паходжан-ня”: “доклад тов. Берия использован чрезвычайно слабо”, “совершенно не показана огромная руководящая работа в эпоху реакции и подъёма вождя партии тов. Сталина”, “продолжает красоваться фото врага партии троцкиста Невского”, “помещены два документа за подписью Чернушевича Дмитрия, исключенного из партии во время проверки документов (белорусский эсер)” [10] і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вінаватым, вядома, заўсёды прызнавалі дырэктара, таму не дзіва, што за пятнаццаць гадоў працы музея ЦВК БССР змяніў у ім дзевяць дырэктараў: Самуіл Агурскі, Мікалай Шапавалаў, Ашэраў, Леон Майзель, Мікалай Кушнераў, Арцём Данільчык, Іосіф Раманчук, Мікалай Гракаў, Гдалій Скакальскі. Ніводны з іх не ўтрымліваўся на пасадзе больш за два гады. Ашэраў страціў партыйны білет, а разам з ім і пасаду. Мікалай Кушнераў раптоўна памёр. У 1936 г. быў арыштаваны Арцём Данільчык. Праз тры гады той жа лёс напаткаў Іосіфа Раманчука. Ахвярамі сталінскіх рэпрэсій сталі і некаторыя музейныя супрацоўнікі: у 1935 г. быў асуджаны Мікалай Кійко, у 1937 г. – Сара Розіна (Разганская), у 1938 г. – Макс Злота і Самуіл Агурскі, у 1943 г. – Гдалій Скакальскі.

С.Агурскаму падчас следства нагадалі, што ён у экспазіцыі музея змяшчаў матэрыялы Бунда, БСГ, эсэраў і іншых апазіцыйных партый. А.Данільчыка абвінавачвалі ў тым, што ў музеі "красаваліся" фотаздымкі трацкістаў Г.Гая і У.Неўскага. І.Раманчуку, якому ЦК КП(б) двойчы даручаў кіраўніцтва музеем, урэшце "прышпілілі" шкодніцкі ўчынак па затрымцы рээкспазіцыі. М.Кійко як парторг музея "недастаткова мабілізаваў камуністаў на выпраўленне шэрага палітычных памылак у працы музея". С.Розіна дапускала ў рабоце шэраг палітычных "ляпсусаў", праявіла палітычную слепату і няпільнасць у адносінах да выставы "Шлях Леніна", арганізаванай дырэктарам Ашэравым, дзе былі змешчаны матэрыялы аб Троцкім. М.Злота захоўваў у адкрытым фондзе артыкулы Троцкага, Зіноўева і Сасноўскага.

Усе пералічаныя асобы абвінавачваліся ў контррэвалюцыйнай, шпіёнскай дзейнасці і былі асуджаны па 68, 72 або 76 артыкулах Крымінальнага кодэкса БССР. Толькі Г.Скакальскі пазбег расправы. Аднак падчас Вялікай Айчыннай вайны ён не паспеў эвакуіравацца з Мінска і самастойна рушыў на Усход. Па дарозе быў затрыманы нямецкай паліцыяй, пад прымусам нейкі час працаваў у якасці нямецкага перакладчыка. Калі, нарэшце, Скакальскі трапіў да нашых войскаў, то быў асуджаны як здраднік.

Вывучэнне судовых спраў паказвае, што людзей абвінавачвалі, не клапоцячыся пра доказы. Многія пратаколы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

допыту падпісваліся абвінавачваемымі пад жорсткім прымусам і здзекамі. Пра гэта сведчаць лісты асуджаных. Вось некаторыя вытрымкі з іх. І.Раманчук: “... ко мне применены были всевозможные физические пытки до потери сознания” [11]; С.Розіна: “... избивали меня двое: следователь, который вел мое следствие, и другой, вошедший во время допроса. Своими ногами он бил меня в живот. За волосы тянул меня по полу и головой бил в стену. Ремнем избивали меня по всему телу” [12]. Мэліб, сын С.Агурскага, сведчыў, што бацьку “... били мраморным пресс-папье, загоняли под ногти иглы” [13].

З-за шматлікіх арыштаў музей страчваў вопытных супрацоўнікаў, што адмоўна адбівалася на яго дзейнасці, губляў сваю мастацкую каштоўнасць. Сцены былі пакрыты сотнямі фотаздымкаў. Так, толькі ў аддзеле “Рэвалюцыя 1905–1907 гг.” экспанавалася 100 фотаздымкаў [14], лозунгаў, вытрымак з партыйных рэзалюцый або сачыненняў кіраўнікоў. За пяць гадоў, з 1931 г. па 1936 г., фонды папоўніліся толькі на 1308 адзінак [15].

21 жніўня 1938 г. быў ліквідаваны Гістпарт, а летам 1939г. Музей рэвалюцыі перамясціўся ў будынак Акадэміі навук БССР – у непрыстасаванае для музейнай эксплуатацыі памяшканне плошчай 110 кв.м. Там была разгорнута экспазіцыя, структураваная па главах “Кароткага курса гісторыі ВКП(б)”, якая не карысталася папулярнасцю. За шэсць месяцаў 1940 г. яе наведалі толькі 1889 чалавек [16]. Таму ў 1940 г. ЦК КП(б) меркаваў перавесці музей у будынак, які займаў абком партыі (рог сучасных вуліц Леніна і Кірава). Можна меркаваць, што гэты пераезд не адбыўся з-за вайны. Да нацысцкай акупацыі Мінска з Акадэміі навук практычна нічога не ўдалося вывезці. Гітлераўцамі былі знішчаны або вывезены амаль усе матэрыялы. Пакідаючы горад, акупанты спалілі асноўныя будынкі Акадэміі навук. Частка фондаў Музея рэвалюцыі згарэла падчас вайны разам з будынкам Дома-музея І з’езда РСДРП. Ацалелі толькі тыя дакументы, якія ў 1936 г. перайшлі да Інстытута гісторыі партыі. Пасля вайны Музей рэвалюцыі БССР не аднавіўся.

Такім чынам, бальшавіцкая партыя надавала свайму іміджу ў БССР выключнае значэнне. Тут дзейнічалі фактыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на два музеі рэвалюцыйнай тэматыкі, аднак ідэалагічны прэс не дазволіў ім на дастаткова высокім мастацкім узроўні паказаць рэвалюцыйную эпоху, а лёс супрацоўнікаў музея ўвогуле стаў трагічным. Аднак крытычнае асэнсаванне дзейнасці Музея рэвалюцыі з усведамленнем адмоўнага і станоўчага паспрыяла фарміраванню музейнай мадэлі ў пасляваенны час.

---

1. *Рафиенко Е.Н.* Роль историко-революционных музеев в становлении музейного дела СССР в 1920-е годы // Формы и методы научно-просветительной работы музеев: Сб. науч. тр. – М.: Центральный музей революции СССР, 1986. – С. 71.

2. НА РБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 179. Т. 1. С. 174.

3. Открытие Музея революции // Звезда. – 1926. – 1 мая. – С. 5.

4. НА РБ. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 247. С. 11–19.

5. Там жа. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 11. С. 220.

6. РДАСПГ. Ф. 70. Воп. 2. Спр. 56. С. 18.

7. НА РБ. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 2565. С. 144–166.

8. Там жа. Спр. 48. С. 4–7.

9. НА РБ. Ф. 1367. Воп. 1. Спр. 10. С. 33–35.

10. КДБ РБ. Арх. спр. 17387-С: У 5 т. – Т. 2. – С. 223–239.

11. КДБ РБ. Арх. спр. 5923-С. С. 50–54.

12. КДБ РБ. Арх. спр. 6346-С. С. 46–49.

13. КДБ РБ. Арх. спр. 5899-С. С. 213–216.

14. НА РБ. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 202. С. 18–23.

15. Там жа. Спр. 247. С. 11–19.

16. *Гужалоўскі А.А.* Музеі Беларусі 1918–1941 гг. – Мн., 2002. – С. 60.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*І.В.Кудыбін*

## ПРАБЛЕМА ЎВАСАБЛЕННЯ ІДЭІ СІНТЭЗУ МУЗЫКІ І ВЫЯВЫ Ў МАСТАЦКІМ ТВОРЫ

У гісторыі мастацтваў назіраюцца дзве тэндэнцыі асэнсавання пытання ўзаемадзеяння мастацтваў. Тэндэнцыя да індывідуалізацыі дапаўняецца імкненнем да ўзаемаўплыву і сінтэзу, які выступае як адна з праяў інтэграцыйных грамадскіх імкненняў.